# КУЛЬТ ШЛЯХЕЦКАГА СТАНУ Ў РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

***Д. В. Шчэрбік***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

З канца XVI ст. Рэч Паспалітая паступова пачынае прыходзіць у заняпад. Шматлікія войны прывялі да заняпаду яе эканомікі, што суправаджалася і палітычным крызісам. Але войны забяспечылі дамінуючую вайсковую і палітычную ролю шляхты і магнатаў у краіне. Выгадная вонкавая рыначная кан`юнктура ў выглядзе высокіх коштаў на збожжа, забяспечыла іх эканамічную магутнасць, замацавала прыгонніцкія адносіны. Маруднае развіццё буржуазных адносін у эканоміцы, сінтэз сярэдневяковых уяўленняў з элементамі пратэстанцкай ідэалогіі ў выніку прывялі да распрацоўкі і распаўсюджання культу шляхецкага стану.

Культ шляхецкага стану засноўваўся на падмурку ўяўленняў пра агульнае паходжанне шляхты ВКЛ. Першапачаткова агульнае паходжанне выводзілася са старажытнага Рыма ў адпаведнасці з легендай пра Палемона, яно выступала як аснова для адчування сваёй асабовасці, высакароднасці ў ідэалагічнай спрэчцы з палякамі напярэдадні заключэння Люблінскай уніі. Пасля змены геапалітычнай сітуацыі, легенда пра Палемона была дапасавана да легенды пра сарматаў як агульных продкаў палякаў і літвінаў.

Адзінства паходжання падкрэслівала роўнасць і аднароднасць шляхецкага стану Рэчы Паспалітай. Высокія заслугі шляхты расхвальваліся

часцей за ўсё на прыкладах дзейнасці канкрэтных магнатаў (Радзівілаў, Сапегаў, Хадкевічаў і інш.). Апошніх апісвалі як узоры патрыятызму, храбрасці, дзяржаўнай мудрасці, бескарыслівасці і г. д. Падкрэсліваліся заслугі шляхты ў барацьбе з «няверныммі» (туркамі), «схізматыкамі» (маскавітамі), ерэтыкамі-пратэстантамі (шведамі), што нібыта працягвала традыцыю перамог сарматаў над рымлянамі. Тэорыя шляхецтва будавалася на канцэпцыі «прыроджанай высакароднасці», згодна з якой высокая сацыяльная карыснасць шляхецтва вынікае са значнасці крыві, «высакароднасці» паходжання, якое адрознівала шляхту ад іншых станаў. Шляхта «адлучыла ад сваёй высакароднасці аратага, рамесніка, купца». Няшляхта – толькі слугі дзяржавы, іх статус – непалітычны. Распаўсюджваецца пастулат «нацыя – гэта шляхта».

Пашырэнне ўплыву шляхты прывяло да пашырэння поглядаў на дагаворную прыроду адносін паміж шляхтай і каралеўскай уладай. Шляхецкія свабоды трактаваліся як спрадвечныя. Экзекуцыйная праграма патрабавала вяртанне шляхце тых адвечных правоў, якія быццам бы незаконна адабрала каралеўская ўлада. Апошняя з'ўляецца толькі вартай прывілей.

Сярод пануючага класу склалася перакананне аб дасканаласці дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. Яна лічылася прыкладам найлепшай формы кіравання – змешанай (паводле канцэпцыі Арыстоцеля), якая гарантуе сапраўдны росквіт свабоды. Пры гэтым свабода, адсутнасць іншых гаспадароў, акрамя Бога і Айчыны, цесна спалучаецца з роўнасцю. Спецыяльнымі рашэннямі шэрага соймаў неаднаразова забаранялася надзяляць шляхту тытуламі, званнямі, ордэнамі (за выключэннем княжацкіх тытулаў, агавораных у акце Люблінскай уніі). Роўнасць рэалізуецца і праз прынцып аднагалосся пры прыняцці соймавых пастаноў («liberum veto»).

Першапачаткова культ шляхецкага стану сведчыў пра агульную адказнасць за дзяржаву, дазваляў развіццё мясцовага самакіравання, выклікаў пашану да асаблівасцей правінцый, спрыяў росту прававой свядомасці шляхты, пашане прынцыпу законнасці.

Аднак паступова манапалізацыя ўлады ў руках шляхты прывяла да гіпербалізацыі яе ролі ў дзяржаве, паралічу органаў улады. Фармальна досыць шырокія канстытуцыйныя паўнамоцтвы караля з-за ўсеўладдзя шляхты фактычна не рэалізоўваліся ім самастойна. «Liberum veto», у сваю чаргу, паралізавала і дзейнасць сойма. Кіраванне перайшло да мясцовых органаў, якія знаходзіліся пад уплывам розных магнацкіх груповак. Рэч Паспалітая пачала распадацца на шэраг самастойных рэгіёнаў, якія дзейнічалі паасобку, разрознена і запаўнялі ўнутрыпалітычнае жыццё дзяржавы міжусобіцамі і сутыкненнямі.